# ВЫКАРЫСТАННЕ КЕЙС-ТЭХНАЛОГІЙ НА ЗАНЯТКАХ ПА ПРАВАВЫХ АСНОВАХ ЖУРНАЛІСТЫКІ

***В. А. Зразікава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zrazikova@tut.by*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці выкарыстання кейс-тэхналогій у навучальным працэсе. Апісваюцца прыёмы і спосабы рэалізацыі метаду кейс-стады, заснаванага на прымяненні практыка-арыентаванага падыходу, што значна павышае эфектыўнасць практычных заняткаў.

Кейсы развіваюць у студэнтаў уменне ацэньваць праблему, знаходзіць альтэрнатыўныя шляхі вырашэння і выбіраць аптымальны варыянт. Прыводзяцца прыклады кейса «Аўтарскае права».

***Ключавыя словы:*** аўтарскае права; задача; кейс; мадэляванне; метад; праблемная сітуацыя.

# USING CASE TECHNOLOGIES IN THE CLASSROOM ON THE LEGAL FOUNDATIONS OF JOURNALISM

***V. A. Zrazikava***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. A. Zrazikava (zrazikova@tut.by)*

The article discusses the features of using case technologies in the educational process. Methods and ways of implementing the case study method based on the application of a practice-oriented approach are described, which significantly increases the effectiveness of practical training.

Cases develop students' ability to evaluate a problem, find alternative solutions and choose the best option. Examples of cases «Copyright» are given.

***Key words:*** copyright; task; case; modeling; method; problem situation.

З пункту гледжання кампетэнтнаснага падыходу адной з мэт прымянення інавацыйных педагагічных тэхналогій у працэсе навучання з’яўляецца фарміраванне ключавых асобасных кампетэнцый (здольнасць да самаразвіцця, адказнасць, самастойнасць, пазнавальная актыўнасць).

Выкарыстанне інавацыйнага падыходу ў вышэйшай школе адлюстроўваюць практыкі мадэлявання, праектавання, актыўныя і інтэрактыўныя формы работы са студэнтамі, розныя віды трэнінгаў, семінараў з уключэннем такіх элементаў.

Тэхналогія кейс-стады з'яўляецца эфектыўным спосабам арганізацыі заняткаў са студэнтамі. Сутнасць такой работы заключаецца ў тым, што навучэнцам прапануецца апісанне сітуацыі, спецыяльна падрыхтаванай на аснове актуальнага фактычнага матэрыялу з мэтай далейшага аналізу. Добры кейс павінен адлюстроўваць тыповую праблемную сітуацыю, быць цікавым і выклікаць дыскусію.

Асноўны сэнс метаду канкрэтных сітуацый заключаецца ў змяненні адносін слухачоў да самастойнага працэсу навучання, у павышэнні адказнасці за яго вынікі. Пры гэтым канкрэтныя сітуацыі рэалізуюць розныя функцыі (у залежнасці ад вызначанай выкладчыкам задачы) і падзяляюцца на ілюстратыўныя, нарматыўныя, функцыянальныя і стратэгічныя [1, с. 9–10].

Падчас стварэння кейса неабходна ўлічваць комплекс рэлевантных акалічнасцяў: віды кейсаў (структураваныя, неструктураваныя, поўныя, міні-кейсы, папяровыя, відэа), планаванне заняткаў (арганізацыя, матывацыя да заняткаў, пастаноўка мэты, інструктаж, самастойная работа з кейсам, падвядзенне вынікаў, заданне дадому), структура кейса (кантроль зыходных ведаў, сітуацыя, пытанні і заданні да кейса, дадаткі (тэарэтычны матэрыял), каментарыі да сітуацыі)), метады работы з кейсам (мадэляванне, мысленне, праблемны метад, метад апісання, метады гульні, мазгавая атака, дыскусія). Арганізацыя работы з кейсам уключае чатыры этапы: падрыхтоўчы, «пагружэнне» ў сумесную дзейнасць, яе арганізацыя, аналіз і рэфлексія [1, с. 17].

Звернемся да кейса «Аўтарскае права», распрацаванага для студэнтаў 2 курса факультэта журналістыкі БДУ. Матэрыялы кейса можна выкарыстоўваць на практычных занятках, у тым ліку і ў фармаце дыстанцыйнага навучання (платформа Moodle), а таксама падчас правядзення прамежкавай атэстацыі.

Мэта кейса – навучыць прымяняць заканадаўчыя нормы, што рэгулююць адносіны паміж праваўладальнікамі і прававыкарыстальнікамі, у прафесійнай дзейнасці журналістаў і спрыяць павышэнню прававой культуры суб'ектаў, развіццю паважлівых адносін да правоў аўтараў і выканання закона. Кейс мае тры часткі, структураваныя па прынцыпе павелічэння ўзроўню складанасці: «Агульныя палажэнні», «Праблемная сітуцыя», «Мадэляванне».

Першая частка ўключае тэарэтычныя палажэнні («Асноўныя паняцці»), практычнае заданне (тэст «Асновы аўтарскага права» – 16

пытанняў) і задачы, рашэнне якіх патрабуе аргументаванасці адказаў і звароту да нацыянальнага заканадаўства ў галіне аўтарскага права.

Першая задача. *У газеце быў апублікаваны ліст чытача. Назаўтра аўтар ліста прыйшоў у газету з абвінавачваннямі ў парушэнні яго аўтарскіх правоў. Ён лічыў, што рэдакцыя газеты не мела права скарачаць тэкст ліста і рэдагаваць яго. Рэдакцыя не пагадзілася з тым, што парушыла яго аўтарскія правы, бо, на яе думку, скарачэнне тэксту і яго рэдагаванне не змянілі сэнс ліста. Хто мае рацыю ў гэтай спрэчцы?*

Другая задача. *Карэспандэнт сеткавага СМІ ўзяў інтэрв'ю ў вядучага спецыяліста навукова-даследчага інстытута. Паколькі тэма інтэрв'ю датычыла спецыяльных ведаў, журналіст загадзя перадаў пытанні спецыялісту і папрасіў падрыхтаваць адказы. Пасля апублікавання інтэрв'ю спецыяліст патэлефанаваў у рэдакцыю і пацікавіўся, калі яму выплацяць ганарар. У якім выпадку інтэрв'юраваны можа патрабаваць аўтарскае ўзнагароджанне?*

Трэцяя задача. *У часопісе апублікаваны артыкул А. Міронава «Праблемы развіцця фондавага рынку». Праз тыдзень аўтар публікацыі знайшоў, што больш за палову яго матэрыялу ўзноўлена на сайце іншай газеты ў рубрыцы «Навіны дня» без пазначэння яго імя.*

*Ці ёсць у А. Міронава прычыны для звароту ў суд? Як ён можа абгрунтаваць свае іскавыя патрабаванні? Ці мог ён звярнуцца ў суд, калі б газета пазначыла яго імя?*

Другая частка кейса «Праблемная сітуацыя» прадугледжвае работу студэнтаў з тэкстам, абмеркаванне пытанняў (аптымальная колькасць 4–5), публічныя выступленні, дыскусіі, дзелавую гульню (пры неабходнасці).

Ілюстрацыйным матэрыялам для праблемных сітуацый могуць быць розныя крыніцы: паведамленні ў СМІ, судовыя справы і пастановы (напрыклад, размешчаныя на сайце Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь), выдуманыя гісторыі. Да гэтага можна далучаць дапаможную інфармацыю (даведкі, вытрымкі з законаў, спасылкі на навуковую літаратуру, інтэрв'ю, відэа), каб студэнты лепш арыентаваліся ў выбары правільнага алгарытму рашэння. Як правіла, вакол праблемных сітуацый разгортваюцца цікавыя дыскусіі, бо прырода канфліктаў у галіне аховы і абароны аўтарскіх правоў даволі неадназначная і шматаспектная.

Трэцяя частка «Мадэляванне» належыць да задання павышанай складанасці. У выніку папярэдняй работы па сістэматызацыі тэарэтычных ведаў і аналізу канкрэтных сітуацый у студэнтаў сфарміраваліся адпаведныя кампетэнцыі (камунікатыўныя, аналітычныя, прафесійныя). На гэтым этапе можна прапанаваць стварыць уласны кейс: смадэляваць праблемную сітуацыю з доказным рашэннем.

Заданне можна выконваць рознымі спосабамі і метадамі: мазгавы штурм, індывідуальная ці парная / групавая работа, форум. Выкладчык можа прапанаваць пытанні, што стануць своеасаблівым каркасам для мадэлявання кейса. Напрыклад, праз наступныя пытанні студэнтам будзе прасцей прыдумаць кейс пра парушэнні аўтарскіх правоў у інтэрнэце.

1. Калі вэб-дызайнеру спадабалася афармленне старонкі, ці можа ён скапіраваць яе, замяніўшы тэкст, выявы і рэквізіты сваімі?

2. Ці парушае ён пры гэтым правы стваральніка сайта?

3. Калі пры гэтым змяніць каляровую палітру?

4. Калі дызайнер скарыстаецца толькі фрэймамі кіравання, але дызайн распрацуе сам?

Абавязковым элементам выканання кейса з’яўляецца рэфлексія: яна дазваляе высветліць агульныя ўражанні ад кейса, ацаніць, як студэнты бачаць сваю работу, ці дасягнута мэта, да якіх высноў прыйшлі, ці дапаможа кейс пазбегнуць памылак у будучыні. Выкладчык аналізуе звесткі, падводзіць вынікі работы, дае практычныя рэкамендацыі і акрэслівае перспектывы.

Пры падрыхтоўцы журналістаў у межах курса «Прававыя асновы журналістыкі» кейс-метад дазваляе актуалізаваць тэрэтычныя веды па аб’ёмных і складаных тэмах, а таксама практычны вопыт навучэнцаў, іх здольнасць аргументавана выказваць думкі і прапановы, уменне слухаць альтэрнатыўную пазіцыю, працаваць у камандзе, удасканальваць свае аналітычныя і ацэначныя навыкі.

Выкарыстанне гэтага метада неабходна яшчэ і таму, што ён дазваляе ўбачыць неадназначнае рашэнне праблем у рэальным жыцці, а значыць, шукаць найбольш рацыянальныя выхады з падобных сітуацый. Паколькі журналіст з’уляецца актыўным суб’ектам прававых узаемаадносін, то дасканалае веданне асноў і механізмаў прававога медыярэгулявання дапаможа яму пазбегнуць парушэнняў у прафесійнай дзейнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Сборник кейсов для вузов по дисциплинам гуманитарного и социально-экономического цикла: учебно-методическое пособие. СПб. : Издательство Санкт-Петербургского университета управления и экономики, 2015. 138 с.